**Литература**

1. 驻白俄罗斯大使谢小用就中华人民共和国成立74周年接受白国家通讯社专访 [Посол в Беларуси Се Сяоюн дал интервью Белорусскому телеграфному агентству по случаю 74-й годовщины образования Китайской Народной Республики] [Электронный ресурс]. // Посольство КНР в РБ. – Режим доступа: https://www.mfa.gov.cn/zwbd_673032/wjzs/202310/t20231007_11156289.shtml. – Дата доступа: 15.09.2023.

2. 崔启明大使看望中国留白学子 [Посол Цуй Цимин посетил китайских студентов в Беларуси] [Электронный ресурс]. // Посольство КНР в РБ. – Режим доступа: http://by.china-embassy.gov.cn/sssgxwdt/201402/t20140207_2163715.htm. – Дата доступа: 18.09.2023.

3. 驻白俄罗斯大使崔启明出席2019年中国留白学生新春联欢晚会 [Посол в Беларуси Цуй Цимин принял участие в новогоднем концерте 2019 г.] [Электронный ресурс]. // Посольство КНР в РБ. – Режим доступа: http://by.china-embassy.gov.cn/sssgxwdt/201901/t20190117_2164885.htm. – Дата доступа: 18.09.2023.

4. 中国驻白俄罗斯大使馆向在白留学生和华侨发放"春节包" [Посольство Китая в Беларуси раздает «Праздничные пакеты весны» студентам и зарубежным китайцам в Беларуси] [Электронный ресурс]. // Посольство КНР в РБ. – Режим доступа: http://by.china-embassy.gov.cn/sssgxwdt/202201/t20220124_10632388.htm. – Дата доступа: 18.09.2023.

## В. Нэзвал як прадстаўнік паэтызму

*Шлемен Ю. А., асп. БДУ,*
*навук. кір. Вострыкава А. У., канд. філал. навук, дац.*

В. Нэзвал зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё чэшскай паэзіі. Ён лічыцца адным з заснавальнікаў выключна чэшскага кірунку – паэтызму. У 1924 г. К. Тэйге ў артыкуле «Паэтызм» прадставіў асноўную канцэпцыю новага кірунку. Гэта было пачаткам паэтызму, які яшчэ пазней быў падрабязна апісаны і разгледжаны В. Нэзвалам у «Маніфесце паэтызму». Руская даследчыца Л. Н. Будагова наступным чынам акрэсліла ўзнікненне дадзенага кірунку: «*У 1923 г. Нэзвал разам з Тэйге «вынаходзяць паэтызм", спосаб амаладзіць свядомасць мастака, вярнуць яму дзіцячую свежасць успрыняцця, а паэзіі – яе прыродныя ўласцівасці – непасрэднасць, лёгкасць, лірызм* […]» [1, с. 369].

Паэтысты ўспрымалі свет як паэму, якую ўяўлялі ў якасці гульні, што нараджае новыя сусветы, а рыфма ўспрымалася як гульня паміж жыццём і смерцю. Да найбольш значных твораў гэтага перыяду ў творчасці заснавальніка паэтызму адносіцца паэма «Эдысан» (Edison, 1928), у якой аўтар спрабуе апець багаты духоўны свет чалавека-стваральніка.

Адным з самых галоўных матываў, што непасрэдна звязаны з закранутай праблематыкай і тэматыкай твора, становіцца вобраз лямпачкі, а менавіта яе ніткі, якая і прадстаўляе сабой важнасць развіцця і адкрыццяў. Зварот да такога матыву дазваляе аднесці прааналізаваную паэму да паэтысцкага кірунку. Нездарма М. Лаштавічка адзначаў, што «*маладых мастакоў зачароўвалі магчымасці тэхнічнай цывілізацыі*» [2]. Тэхнічны прагрэс і развіццё свету таксама становяцца важнымі для паэтыстаў, а таму В. Нэзвал у сваёй паэме закранае тэму развіцця цывілізацыі, паколькі аўтар непасрэдна звяртаецца да асобы Эдысана, яго адкрыццяў і ўплыву дзейнасці навукоўца на грамадства.

У першай частцы чытач сустракаецца з лірычным героем, які расказвае пра сваю дарогу дадому. З дапамогай ужытага рэфрэна аўтар стварае змрочны настрой: «*Bylo tu však něco těžkého co drtí // smutek stesk a úzkost z života i smrti*» («*Было тут аднак нешта цяжкае што знішчае // смутак туга і трывога ад жыцця і смерці*») [3, с. 5]. На масце праз раку Влтаву герой бачыць вобраз. Размаўляючы з ім, ён прыходзіць да высновы, што гэта «прывід», які выглядае як самазабойца. Нечаканасць такой сустрэчы падкрэсліваецца выклічнікамі: «*vykřikl jsem ach! // ne vy nejste hráč! ne vy jste sebevrah!*» («*выкрыкнуў я ах! // вы не гулец! вы самазабойца!*») [3, с. 7]. Увядзенне незвычайных і нечаканых вобразаў, распачатае творцам у перыяд паэтызму, стане важным і яскравым элементам яго паэзіі ў далейшым. Як адзначала К. Айзпурвіт, руская багемістка, «*В. Нэзвал – найяскрайвейшая з'ява чэшскай і еўрапейскай літаратуры XX ст., з якім мала хто параўнаецца па багацці фантазіі, феерычнай разнастайнасці і шматпланавасці вобразаў*» [4].

Калі лірычны герой вяртаецца дадому і пачынае чытаць газету, то знаходзіць артыкул, дзе пералічаюцца поспехі і адкрыцці Эдысана. Сам вынаходнік апісваецца з дапамогай эпітэта і параўнання, якія вылучаюць яго вобраз сярод акрэсленай трывогі і тугі: «*uzřel velkou podobiznu Edisona // byl tu jeho nejnovější vynález // seděl v taláru jak středověký kněz*» («*убачыў вялікі партрэт Эдысана // было тут яго найноўшае адкрыццё // сядзеў у мантыі як сярэднявечны князь*») [3, с. 8]. Напрыканцы першай часткі змяняецца і гучанне самой паэмы, паколькі лірычным героем авалодваюць радасныя і шчырыя пачуцці: «*bylo tu však něco krásného co drtí // odvaha a radost z života i smrti*» («*было тут аднак штосьці прыгожага што нішчыць // адвага радасць ад жыцця і смерці*») [3, с. 8]. Такі пераход ад сумных і змрочных матываў, ад адчування трывогі і смерці да радасных і аптымістычных настрояў з'яўляецца тыповай прыкметай паэтысцкіх твораў.

Такім чынам, Віцезслаў Нэзвал стаў адным з заснавальнікаў чэшскага паэтызму ў літаратуры. Асноўная частка яго твораў напісана ў рэчышчы дадзенага кірунку, да якіх належыць знакамітая паэма «Эдысан».

Выкарыстанне разнастайных мастацкіх тропаў (эпітэты, метафары, параўнанні) і стылістычных фігур (клічныя сказы, рэфрэны), уласцівых паэтызму, падкрэслівае значнасць апісаных падзей і вобразаў, перадае аўтарскае захапленне тэхнічным развіццём цывілізацыі. Адсутнасць знакаў прыпынку і выкарыстанне толькі выклічнікаў, пытальнікаў і кропак напрыканцы сказаў становіцца таксама важнай рысай паэтызму, якую выкарыстаў аўтар. Гэта дазваляе чытачам сканцэнтравацца пераважна на важнасці адкрыццяў, апісаных у паэме. Узвялічванне асобы вынаходніка, увядзенне вобраза Эдысана і павага да яго адкрыццяў дазваляюць пераканацца ў тым, што дадзеная паэма з'яўляецца яскравым прыкладам твора, напісанага паводле асноўных прынцыпаў паэтызму.

**Літаратура**

1. Будагова, Л. Н. На чаше весов истории. – Витезслав Незвал (26.V.1900 – 6.ГУЛ958). / Л. Н. Будагова. // Славянский альманах, 2001. – С. 369-376.

2. Лаштовичка, М. Поэтизм – исходно чешское литературное направление, или Способность к игре [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ruski.radio.cz/poetizm-ishodno-cheshskoe-literaturnoe-napravlenie-ili-sposobnost-k-igre-8067023. – Дата доступу: 10.11.2023.

3. Nezval, V. Edison. / Vitezslav Nezval. – Praha: Plejada, 1928. – 49 s.

4. Айзпурвит, К. Авангард, сюрреализм, компартия. Множественное число поэзии Витезслава Незвала [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ruski.radio.cz/avangard-syurrealizm-kompartiya-mnozhestvennoe-chislo-poezii-vitezslava-nezvala-8681769. – Дата доступу: 10.11.2023.

## Характеристики спортивных изданий

*Ян Чжаоцзюнь, студ. IV к. БГУ,*
*науч. рук. ст. преп. Силина-Ясинская Т. В.*

Спортивные издания – это публикации, посвященные спорту и всему, что с ним связано. Они имеют свои особенности и характеристики:

– Спортивные издания фокусируются на событиях, командах, игроках, тренерах и всем, что связано со спортом. Они могут покрывать различные виды спорта, от футбола и баскетбола до гольфа и тенниса.

– Спортивные издания предоставляют свежие новости, анализ и статистику спортивных событий. Они следят за текущими событиями и предоставляют читателям обзоры матчей, интервью с игроками и экспертные мнения.

– В спортивных изданиях часто публикуются качественные фотографии и видеорепортажи о спортивных событиях. Это позволяет читателям прочувствовать атмосферу соревнований.